Запартыка, А. М. Калекцыя дакументаў Мікалая Мікалаевіча Улашчыка ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь / А. М. Запартыка// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 20-23

**А. М. ЗАПАРТЫКА (Мінск)**

# КАЛЕКЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА УЛАШЧЫКА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АРХІВЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь — адзін з буйнейшых архіваў нашай краіны, які вядзе сваю гісторыю з 1927 г., захоўвае не толькі фонды органаў дзяржаўнай улады рэспублікі, дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый, але і дакументы асабістага паходжання.



На сучасны момант у архівасховішчы асабістых фондаў НАРБ размешчана 44 асабістыя фонды, 6 калекцый, што складае 9730 адз. зах. У складзе названых шасці калекцый ёсць калекцыя пад назвай «Калекцыя асабістых дакументаў вучоных Беларусі». Вопіс 9 гэтай калекцыі склалі дакументы М. М. Улашчыка. Аснову калекцыі склалі дакументы, перададзеныя ўдзельнікамі навуковай канферэнцыі «М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага)» А. В. Мальдзісам, М. Ф. Раманюком, В. У. Скалабанам, У. І. Содалем, а таксама дакументы аб святкаванні 90-годдзя з дня нараджэння М. М. Улашчыка, атрыманыя з Беларускага навукова-даследчага цэнтра дакументазнаўства, археаграфіі і архіўнай справы, карэктуры і падрыхтоўчыя матэрыялы выдадзеных у БелНДІДАС прац з яго рукапіснай спадчыны.

Навукова-тэхнічная апрацоўка архіва М. М. Улашчыка ажыццяўлялася ў 2005 г., у выніку чаго састаўлены вопіс у колькасці 21 справы, якія ўключаюць 127 дакументаў.

У калекцыі вучонага захоўваецца ксеракопія аўтабіяграфіі, біябібліяграфічны паказальнік М. М. Улашчыка, складзены да яго 90-годдзя А. К. Каўкам, В. У. Скалабанам, Р. М. Чыгіровай, і падрыхтоўчы матэрыял да яго (спісы навуковых прац М. М. Улашчыка, артыкул «У вянок аддраджэнцаў» падрыхтаваны А. К. Каўкам да 90-х угодкаў навукоўца, артыкул В. А. Чамярыцкага «Мікалай Улашчык» для біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі» (Мінск, 1995), прадмовы да выдання). Макет кнігі М. М. Улашчыка «Нарысы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі дасавецкага перыяду» карэктуры кніг «Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі» (укладальнікі Я. М. Кісялёва і В. У. Скалабан), «Мемуары і дзённікі як крыніцы па гісторыі Беларусі», рукапіс кнігі «Краязнаўства (Нататкі пра бадзянні ў 1924—1929 гг.)», аўтарэферат дысертацыі М. М. Улашчыка на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук «Сельская гаспадарка Літвы і Заходняй Беларусі ў першай палове XIX в. (Перадумовы сялянскай рэформы 1861 г.)», заўвагі М.М. Улашчыка на артыкулы «Мялешка Міхаіл Вінцэнтавіч» і «Мачульскі Васіль Фёдаравіч» і план яго выступлення на тэлебачанні ў перадачы «Роднае слова», паведамленні ў газеце «Беларускае радыё і тэлебачанне» аб выступленні. Справа артыкула «М. М. Улашчык» для 10-га тома 12-томнай Беларускай савецкай энцыклапедыі: асноўныя біяграфічныя звесткі і друкаваныя працы, прадстаўленыя М. М. Улашчыкам для БелСЭ, артыкул аб М. М. Улашчыку, падрыхтаваны М. І. Камінскім, пашпарт артыкула.

Эпісталярная спадчына М. М. Улашчыка прадстаўлена пісьмамі да С. Х. Александровіча, Аляксандры Бергман, А. В. Мальдзіса, В. У. Скалабана, віншаваннем Івану Мележу з днём нараджэння.



Змешчаны ў фондзе і некралог М. М. Улашчыка, перададзены з Масквы ў Мінск А. К. Каўкам і запісаны В. У. Скалабанам, спачуванне сыну М. М. Улашчыка Аляксандру ад БелСЭ.

Значную частку дакументаў складаюць дакументы аб святкаванні 90-годдзя з дня нараджэння М. М. Улашчыка: пратаколы пасяджэння ініцыятыўнай групы па святкаванні і пасяджэння аргкамітэта па правядзенні навуковай канферэнцыі «М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі», прысвечанай 90-годдзю навукоўца, інфармацыйны ліст, праграма і бланк

запрашэння на канферэнцыю, заявы на ўдзел у канферэнцыі А. Грыцкевіча, В. Грыцкевіча, А. Яшчанкі, справаздачы аб працы секцый канферэнцыі, запрашэнні на вечарыны, прысвечаныя яго юбілею. Асобна трэба адзначыць дакументы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю М. М. Улашчыка «Русь — Літва — Беларусь. Праблемы нацыянальнай самасвядомасці ў гістарыяграфіі і культуралогіі», якая прайшла ў Маскве (запрашэнне і праграма) і інш.

Акрамя гэтага, у фонд увайшлі даклады ўдзельнікаў навуковай канфэрэнцыі «М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага)», якая праходзіла 14—15 лютага 1996 г. у Мінску: А. Вялікага, В. Гарбачовай, А. Гесь, А. Грыцкевіча, В. Грыцкевіча, І. Драўніцкага, Ю. Зайца, Э. Іофе, А. Каўкі, А. Кіштымава, У. Конана, Г. Ластоўскага, Л. Лісавай, В. Мальцава, В. Мароз, С. Марозавай, А. Марчук, А.Міхальчанкі, Л. Навіцкай, В. Насевіча, Я. Настыкі, Ю. Несцяровіча, Р. Платонава, А. Сабалеўскага, Г. Сагановіча, С. Салей, Л. Станкевіч, С. Сяльвестравай-Куль, А. Трусава, А. Фядорынай, А. Храмога, В. Чамярыцкага, В. Шведа, М. Шумейкі, А. Яшчанкі.

Пэўную цікавасць уяўляюць негатывы фатаграфій і фатаграфіі М. М. Улашчыка: індывідуальныя і ў групах з М. Купавам, М. Раманюком, А. Марачкіным, У. Крукоўскім, Я. Куліком.

Аддаючы даніну павагі стваральнікам калекцыі, якую, бясспрэчна, у будучым будуць актыўна выкарыстоўваць даследчыкі, трэба дадаць, што яна не адзіная ў НАН Беларусі, дзе захоўваюцца дакументы М. М. Улашчыка. Так, у фондзе БДУ (Фонд 205. Воп. 3. Адз. зах. 8275) захоўваецца асабістая справа студэнта педагагічнага факультэта М. М. Улашчыка, якую падрабязна прааналізавала А. М. Гесь у сваім дакладзе на навуковай канферэнцыі «М.М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага)», якая праходзіла 14—15 лютага 1996 г. у Мінску.

Лічу мэтазгодным пералічыць усе тыя дакументы, якія ўтрымліваюцца ў справе. Гэта фотаздымак навукоўца пачатку 20-х гг., заява, пададзеная М.М. Улашчыкам у прыёмную камісію БДУ, запоўнены ім самім апыталь-



ны ліст для паступаючых у ВНУ і анкета стыпендыяльнай камісіі БДУ, характарыстыка (даведка) і пасведчанне аб сканчэнні 2-й вячэрняй Школы дарослых павышанага тыпу гор. Менску, выпіска з метрычнай кнігі аб нараджэнні М. М. Улашчыка, фармулярны ліст студэнта БДУ, даведкі аб працы ў Беларускай дзяржаўнай і універсітэцкай бібліятэках, аб маёмасным стане бацькі, аб заробку, аб сялянскім паходжанні, аб допуску да іспытаў, студэнцкае пасведчанне М.М. Улашчыка, заява ў камісію па абкладанні падаткамі, «паведамленні» ў праўленне БДУ і прафком педфаку на М. М. Улашчыка і некаторыя іншыя дакументы.